# Васілю Емяльянавічу Лявончыкаву – 80 год!



27 мая споўнілася 80 год **В.Е. Лявончыкаву** – доктару педагагічных навук, прафесару кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, аднаму з заснавальнікаў бібліятэчнага факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Ён 26 гадоў узначальваў кафедры агульнай бібліяграфіі, бібліяграфіі і дакументазнаўства, тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, працаваў дэканам бібліятэчнага факультэта.

Васіль Емяльянавіч нарадзіўся ў вёсцы Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча імя Н.К. Крупскай працаваў інспектарам раённага аддзела культуры, дырэктарам дамоў культуры ў Чэрыкаўскім і Слаўгарадскім раёнах. Непрацяглы час загадваў бібліятэкай вайсковай часці ў Мінску. У 1962 г. В.Е. Лявончыкаў скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага, у якім застаўся працаваць. Спачатку чытаў лекцыі па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, потым выконваў абавязкі намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта. У 1966–1968 гг. вучыўся ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры, дзе пад кіраўніцтвам прафесара А.Д. Эйхенгольца ў 1969 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Общая ретроспективная библиография книг Белоруссии: история и теоретические вопросы», якая стала першым грунтоўным навуковым даследаваннем у галіне нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі. У 1971 г. Васіль Емяльянавіч стаў дацэнтам кафедры бібліяграфіі, у гэтым жа годзе ўзначаліў бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. У 1975 г. адкрыўся Мінскі інстытут культуры (з 1993 г. – Беларускі ўніверсітэт культуры, з 2004 г. – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (БДУКМ), дзе В.Е. Лявончыкаў быў прызначаны дэканам бібліятэчнага факультэта (з'яўляўся ім да 1979 г.). У 1983 г. абраны прафесарам і ўзначаліў кафедру бібліяграфіі, якая пазней стала кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Творчы падыход да педагагічнай дзейнасці стаў характэрнай рысай вучонага як выкладчыка. Ён упершыню ў гісторыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Беларусі распрацаваў і пачаў чытаць курс «Беларуская бібліяграфія», склаў і надрукаваў яго праграму і метадычныя матэрыялы. Прафесар В.Е. Лявончыкаў грунтоўна вывучаў бібліяграфічныя працы акадэміка Я. Карскага, філолага і бібліёграфа Р. Зямкевіча. Аб'ектам даследавання вучонага былі вопісы бібліятэк Свята-Траецкага манастыра ў Слуцку і Дабравешчанскага ў Супраслі; бібліяграфічныя матэрыялы ў прадмовах да выданняў Ф. Скарыны, а таксама яго паслядоўнікаў; друкаваныя каталогі бібліятэк і кнігарняў XIX – пачатку XX ст. і інш. У 1983 г. выйшаў з друку падручнік «Белорусская библиография. Общий курс», у якім разглядаюцца тэарэтычныя асновы беларускай бібліяграфіі, яе гісторыя, арганізацыя і методыка.

У 1988 г. Васіль Емяльянавіч абараніў у Маскве доктарскую дысертацыю на тэму «Система библиографической информации союзной республики: теоретико-методологические проблемы». Вынікі гэтага даследавання адлюстраваны ў манаграфіі «Система библиографической информации союзной республики: история, современное состояние, проблемы» (1990). Ён таксама аўтар манаграфіі «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг» (1971), першых у Беларусі прафесіянальных слоўнікаў «Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических терминов» (у суаўтарстве з Л.А. Дзямешка, 1992) і «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у суаўтарстве з Л.А. Дзямешка і Р.І. Саматыя, 2000), шматлікіх навуковых артыкулаў у замежным і айчынным друку. Адметныя рысы ўсіх работ: грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэт і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць.

Выдатны навуковы патэнцыял Васіля Емяльянавіча ўвасобіўся ў заснаванай ім у 1994 г. навуковай школе «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», прадстаўнікі якой плённа працуюць у розных бібліятэках Беларусі і замежжа. Ён з'яўляўся таксама адным з арганізатараў аспірантуры ў БДУКМ, дзе выбіраўся старшынёй і намеснікам старшыні савета па абароне дысертацый на ступені кандыдатаў і дактароў навук. Сёння В.Е. Лявончыкаў выкладае на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ. Лекцыі і семінары педагога выклікаюць цікавасць у студэнтаў, раскрываюць перад імі перспектывы навуковых пошукаў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. У апошнія гады ён вывучае праблемы бібліятэчнай камунікацыі як стратэгічнага кірунку ўзаемадзеяння бібліятэкі і грамадства, ролі бібліятэк у сістэме бесперапыннай адукацыі.

Значнае месца ў жыцці вучонага займаюць грамадскія абавязкі. Ён з'яўляецца членам навукова-тэхнічнага савета БДУКМ і савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, уваходзіць у рэдакцыйны савет часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў», рэдкалегію зборніка «Здабыткі» і навуковага зборніка «Бібліятэчны веснік », якія выдаюцца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, і інш. Шмат гадоў Васіль Емяльянавіч быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

намеснікам і галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Вопросы библиографоведения и библиотековедения», шэрагу іншых выданняў. Вучоны ўнёс вялікі ўклад у стварэнне Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, першым прэзідэнтам якой з'яўляўся на працягу 1992–1994 гг. (зараз ганаровы член). У 1993 г. быў абраны акадэмікам Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН (Масква), у 1996 г. членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 Outstanding Scientists of the 21st Century» («2000 выдающихся ученых 21-го века») (2005) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы, у даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (2004) Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН.

За навукова-педагагічную дзейнасць В.Е. Лявончыкаў узнагароджаны ордэнам СССР «Знак Пашаны» (1976), нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2004), шматлікімі медалямі і ганаровымі граматамі.

Рэдакцыйная калегія часопіса «Бібліятэчны свет», выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, калегі Васіля Емельянавіча і яго вучні адрасуюць юбіляру найлепшыя віншаванні і пажаданні новых навуковых здзяйсненняў, таленавітых вучняў, добрага здароўя і настрою!

Summary

Congratulations to Vasil Levonchik on his 80th birthday.



**Галіна Мядзведзева**

**Намеснік загадчыка бібліятэкі імя Д.Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі**

# БІБЛІЯТЭКАР, ПЕДАГОГ, ПУБЛІЦЫСТ

21 сакавіка 2017 г. споўнілася 90 гадоў ветэрану бібліятэчнай працы, педагогу, празаіку, публіцысту, краязнаўцу, члену Саюза пісьменнікаў Беларусі **Віктару Іванавічу Арцем'еву**.

Віктар Іванавіч прайшоў доўгі працоўны шлях, на якім яму ўдавалася арганічна спалучаць бібліятэчную дзейнасць з журналісцкай і пісьменніцкай працай. Яго дабрасумленнасць, прафесіяналізм і адданасць выбраный справе былі неаднаразова адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Ён мае нагрудны знак «За выдатную працу» Міністэрства культуры СССР, медалі «За шматгадовую і дабрасумленную працу», «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», шмат Ганаровых грамат, занесен у «Кнігу Гонару Упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама».

В.І. Арцем'еў працаваў у Парычах загадчыкам раённай бібліятэкай і літсупрацоўнікам раённай газеты «Ленінская перамога». Быў інспектарам па бібліятэках ва Ўпраўленні культуры Магілёўскага аблвыканкама, загадчыкам Чэрыкаўскага раённага аддзела культуры, загадчыкам метадычнага аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна, і карэспандэнтам – арганізатарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР. Увесь час публікуецца ў якасці пазаштатнага карэспандэнта ў мясцовых і рэспубліканскіх перыядычных выданнях.

Віктар Іванавіч амаль 20 гадоў працаваў выкладчыкам Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума імя А.С. Пушкіна. За гэтыя гады ён унес значны ўклад у падрыхтоўку вялікай колькасці маладых бібліятэчных спецыялістаў.

В.І. Арцем'ева без перабольшання можна назваць «співаком» літаратурнай Магілёўшчыны. Сярод яго герояў беларускія паэты Змітрок Марозаў, Анатоль Сербантовіч, Іван Пехцераў, краязнаўца-падзвіжнік Міхаіл Ласоўскі, ветэран вайны, палкоўнік Віктар Асмалоўскі. В.І. Арцем'еў лічыцца бібліёграфам Аляксея Пысіна, з якім яго звязвала шматгадовае сяброўства, і аб творчасці якога ён выдаў некалькі кніг.

90 гадоў – значны юбілей, але, нягледзячы на шаноўны ўзрост, творчай і грамадскай актыўнасці Віктара Іванавіча можна пазайздросціць. Ён сябра Ленінскага раённага і Магілёўскага гарадскога савета ветэранаў, кансультант гарадскога літаратурнага аб'яднання «Ветэран». Ён ахвотна ўдзельнічае ў канферэнцыях, дзе выступае з дакладамі.

Хочацца пажадаць нашаму шаноўнаму ветэрану здароўя і новых цікавых ідэй і тэм для творчасці і заставацца як мага даўжэй такім жа актыўным і дзейсным. Ваша працавітасць і адданасць прафесіі служыць для нас прыкладам.

Summary

The article is devoted to the 90th anniversary of the writer and teacher Viktor Artemyev.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Бібліятэчны свет», 2017, № 3 (96). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 12.06.2017. Фармат 60х84 1/8.
Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 1110 экз. Заказ 748. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2017